©ПГУ

# СТАРААБРАДНІЦТВА Ў ПРАВАВОЙ СІСТЭМЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ НА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

***І. У. МАГАЛІНСКІ*, У. С. ФІЛІПЕНКА**

In this article such problems as the relationships between tsars' power and the dissidence of the Russian Orthodox Church are investigated. During the research the author makes a conclusion that in the second half of XIX – at the beginning of XX centuries tsarism made a radical review of its attitude to schism. The official authorities aimed to get rid of a former adversary and at the same time to find a reliable associate with a help of giving to schism the right to exist as an independent religion. A steady alliance between tsarism and old believers' minority permitted to increase the efficiency of the government's policy on the territory of Belarus

Ключевые слова: раскол царквы, стараабрадніцкая супольнасць, канфесійная палітыка, антыраскольніцкае заканадаўства

Другая палова XIX ст. – гэта найбольш складаны і неадназначны перыяд у гісторыі стараабрадніцтва на Беларусі. Менавіта з гэтым часам звязана змяненне вектара раскольніцкага накірунку канфесійнай палітыкі царскага ўрада. Гнаныя на працягу сваёй гісторыі стараверы змаглі атрымаць пэўны ўзровень рэлігійнай свабоды, да якога імкнуліся на працягу дзесяцігоддзяў. Аднак і ў дадзены перыяд поўнасцю вырашыць праблемы, існуючыя ва ўзаемадачыненнях дзяржавы і стараабрадніцтва, так і не атрымалася.

Канфесійная сітуацыя, што склалася на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст., вызначалася супрацьстаяннем дзвюх галоўных хрысціянскіх канфесій краю – праваслаўя і каталіцтва. Менавіта на праваслаўе была ўскладзена роля асноўнага праваднікa ўрадавай палітыкі на беларускіх землях ва ўмовах наступу на каталіцкі касцёл і выкаранення польскасці з тэрыторыі «паўночна-заходняга краю» [1, с. 71].

Раскольніцкае пытанне станавілася асобным суб'ектам царскай палітыкі ў кантэксце супрацьстаяння каталіцтву і ажыццяўлення русіфікацыі беларускіх зямель праз праваслаўную царкву. Актыўны ўдзел старавераў у паўстанні 1883 – 1864 гг. на баку ўрадавых войскаў абумовіў паступовае пацяпленне ў іх адносінах з дзяржаўнай уладай і царквой [2, с. 117]. Бачачы неабходнасць хутчэйшага насаджэння «рускага элементу» ў краі, царскі ўрад пачаў разглядаць стараабрадніцтва ў якасці патэнцыйнага хаўрусніка ў процівагу ранейшым уяўленням аб расколе як крамоле і пагрозе стабільнасці дзяржавы.

Між тым, гаварыць пра канчатковую ломку ранейшых уяўленняў яшчэ не прыходзілася. Працэс лібералізацыі раскольніцкай палітыкі адбываўся вельмі павольна, пазбягаючы перагібаў і празмернай спешкі. Адпаведныя законы, што прымаліся ўрадам, вельмі часта не ажыццяўляліся ці супярэчылі самі сабе, утрымліваючы адбітак ранейшага негатыўнага стаўлення да стараабрадніцтва, пераадолець якое аказалася вельмі цяжка. Усё гэта не дазволіла канчаткова вырашыць раскольніцкае пытанне ў другой палове XIX ст.

Аднак патрэбы мадэрнізацыі расійскага грамадства выклікалі неабходнасць канчатковага вырашэння праблемы, на якое і быў накіраваны кастрычніцкі маніфест 1905 г. «Об укреплении начал веротерпимости» [3, с. 201]. Менавіта гэты заканадаўчы акт канчаткова павінен быў падвесці рысу пад шматстагоддзевым супрацьстаяннем раскола і дзяржаўнай улады.

Такім чынам, спецыфіка становішча стараверства на беларускіх землях у пазначаны перыяд вызначаецца значным паляпшэннем адносінаў з урадавымі структурамі ў параўнанні са стараабрадніцтвам унутраных губерняў імперыі, што ў вялікай ступені тлумачыцца актыўнай падтрымкай дзяржаўнай палітыкі пад час паўстання 1863 – 1864 гг., а таксама больш хуткімі тэмпамі зменаў у ідэалогіі і рэлігійнай практыцы раскола.

**Літаратура**

1. Канфесіі на Беларусі ( к. XVIII – XX ст. ) / В.В. Грыгор'ева, Н.Н. Завальнюк, У.У. Навіцкі; выпуск. рэд. У.У. Навіцкі – Мн.: ЭП «Экаперспектыва», 1998. – 340 с.
2. *Гарбацкі А. А.* Стараабрадніцтва на Беларусі ў к. XVII – пач. XX ст. – Брэст: БрДУ, 1997. – 202 с.
3. *Прозоров И. А.* История старообрядчества. – М.: Старообрядческая типография «Третий Рим», 2002. – 227 с.

©БГУКиИ

# ЭТНІЧНАЯ САМАІДЭНТЫФІКАЦЫЯ Ў РАЗВІЦЦІ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

***Т. М. МАРМЫШ*, Н. Я. ШАЛУПЕНКА**

Ethnic self-identification is the most significant factor of public association, the system of values, generated by a community of people in conditions of the common way of life taken from the set of interpersonal interactions with the development and translation of symbols and cultural codes. The modern urgency of the ethnic self-identification is predeter-